
Кастусь
Цыбульскі
БАЦЬКОЎСКІ
ЗРУБ

Мінскае абласное аддзяленне
Саюза пісьменнікаў Беларусі

Кастусь ЦЫБУЛЬСКІ

# БАЦЬКОЎСКІ ЗРУБ

вершы

2024

Электронная бібліятэка
Мінскага абласнога аддзялення
Саюза пісьменнікаў Беларусі

*Серыя заснавана ў 2023 годзе*

Пад рэдакцыяй Р. Ю. Малахоўскага

№ 011

**Цыбульскі, К. П.**
Бацькоўскі зруб : вершы / Кастусь Цыбульскі. — Мінск : МАА СПБ, 2024. — 70 с. (Электронная бібліятэка).

© Цыбульскі К. П., 2024
© Падрыхтоўка, афармленне.
ГА “Мінскае абласное аддзяленне
Саюза пісьменнікаў Беларусі”, 2024

**Зямля адна**

Зямля адна у мроіве планет,
І мы адзіныя – зямляне-госці…
Ці хтосьці сёння думаў пра мяне?
Ці заўтра я згадаю пра кагосьці?

А каб жа думаць, жыць адзін адным,
А каб жа век дзяліць акраец хлеба,
І толькі б разам – як агонь і дым,
Да скону разам – як зямля і неба!

***

Трэба дзецям сон
Светлы-светлы,
А матулям свет
Добры-добры.
Трэба людзям хлеб
Смачны-смачны,
А на травы дождж
Чысты-чысты.
Трэба мір зямлі
Вечны-вечны…

**Мой край**

Стыне чысты блакіт,
Шэпча штосьці чарот,
Тут закружана неба вірамі…
Ля імклівай вады,
Гаманлівых ракіт,
Сустракаюць каханыя ранне.

Тут варожыць рака,
Тут лілеі цвітуць,
Тут пявучы з гармонікам вечар..
Непадкупнасць і песня
Народжаны тут
Тут сама нараджаецца вечнасць.

Маладзечанскі край,
Ты і радасць, і боль,
Майго сэрца жывая часцінка.
Тут Жар-птушкай жыве
Незямная любоў,
Што завецца пяшчотна
Ірынкай…

**Браточкам – беларусам**

Родам я не з Рыо-дэ-Жанейра,
Пачуццём – не грэк, не азіят.
Пераняў славянскую манеру:
Праўду ў вочы – горка, ды казаць.

Вырас я не ў штаце Каларада,
Не на здобных булках і бабах.
Прыкіпеў да дзедавага саду,
Да зямлі ў акопах і дубах.

Як на споведзь, я сюды вярнуся,
Дзе ў валошкі вышыты абрус,
Дзе жывуць браточкі-беларусы,
Дзе ў жытах – краіна Беларусь.

Дзе ў матулі – студня і святліца,
Таямнічы прыцемак акон…
Я прыйду сюды, каб памаліцца,
Каб народу свой аддаць паклон.

Як ён змог у сталінскіх засценках,
Дзе сціскалі крыўда і жуда,
Выжыць і святло пранесці ў зрэнках
І яго нашчадкам перадаць?..

Як ён сёння са слязой і чаркай
Ноч палітыкуе давідна,
І спрабуе, курачы цыгарку,
Той Чарнобыль з пеклам параўнаць?!

Мой народ – пясняр і летуценнік,

Хлебароб, цясляр і пчалавод…
Ты не стаў ні разу на калені,
Бурамі
        нескораны
                народ!

***

Цудоўны край мой
        з песняй жаўруковай,
Амытай веснім ветрам
                на палях!
Ты мой да скону,
        і з апошнім словам
Вазьму твой спеў
        у незваротны шлях…

**Землякам**

Жадаю вам на ўсіх зямных дарогах
Зямнога шчасця многа-многа.
Жадаю вам кахаць з надзеяй, верай,
Каб толькі мір ішоў у вашы дзверы.
Жадаю вам з бядою не пазнацца
Падоўгу жыць
Ды вельмі… не спяшацца.

***

Беражыце ў жыцці не гадзіннік –
гадзіны.
Новы дзень яшчэ хмеліць
старое віно,
А на тварах бацькоў
усё болей маршчынаў,
Пераходзяць яны
і на твары сыноў.
Гэта –
мета гадоў на прадметах і тварах,
Ды не ёю адной
толькі значаны мы.
Мы часамі
хвіліны здаём, як шклатару.
Мы гады прадаём
з дэфіцытным таварам
І жывём сярод рэчаў
халодных,
нямых.
Можа,
шмат мы крычалі
пра годнасць і гонар…
Толькі чуецца праўды
надломлены голас
На ліхіх скрыжаваннях жыцця…
І рыпіць на гасцінцы
стамлёнае кола…
Мо з дзяцінства яно, А мо…
з небыцця?

**Бярозы**

*(паводле М. Рубцова)*

Я люблю, калі шумяць бярозы,
Калі лісце сыплецца з бяроз.
Слухаю – і наплываюць слёзы,
Хоць адвыклі вочы ўжо ад слёз.

Ўсё прачнецца ў памяці міжволі,
Адгукнецца ў сэрцы і крыві.
Стане неяк радасна ад болю,
Быццам хтосьці шэпча аб любві.

Ды часцей перамагае проза,
Нібы вее вецер скрухай злой.
Бо шуміць ўсё гэткая ж бяроза
На магіле маці дарагой.

Бацьку на вайне забіла куля,
А ў сяле маім ля агародж
З ветрам і з дажджом шумеў, як вулей,
Толькі ўжо з лістоты медны дождж.

Родны край, люблю твае бярозы,
З першых год я з імі жыў і рос.
Вось чаму і наплываюць слёзы,
Хоць адвыклі вочы ўжо ад слёз.

**Вялікдзень**

Тры акны…
На фіранках – месяцы,
За фіранкамі
спее раніца…
Успамінамі
цеста месіцца,
Успамінамі
ў печы паліцца…
Сонца
велічна усміхаецца,
Быццам з неба
сышла Багародзіца…
Дзед Мікіта
услых жагнаецца:
Эх, Вялікдзень
у хату
просіцца!
Пірагі – як снапы, наўкола,
Каля печы
шчыруе маці…
А на покуці –
Бог вясёлы
І святочны настрой
у хаце. …
За сталом –
сваякі і суседзі:
Кожны чаркай
душу спавядае…
Дзе ж ты ў хаце
сёння уседзіш,
Калі вёска

ў біткі гуляе…
Тры акны…
На фіранках – месяцы,
За фіранкамі
спее раніца…
Успамінамі
цеста месіцца,
Успамінамі
ў печы паліцца…

***

Праламацца б у зоркавы рой,
Пакружыцца б з Венерай у пары,
А затым ёй зайграць на гітары,
Млечны Шлях нацягнуўшы струной.

***

Як многа трэба чалавеку:
Чужыя землі, мора, рэкі…
Чужыя нівы, поле з хлебам –
Ўсё чалавеку трэба, трэба…
…Як мала чалавеку трэба:
Труна і крыж,
два метры глебы.

***

Каля вёсачкі маёй мурог
Колькі год сумуе па касе…
А да мамачкі ўсё менш дарог:
Травянеюць, зарастаюць пакрысе.

Час цячэ нястрымнаю ракой,
Не стрымаць гады, не супыніць…
Меней стала родных, сваякоў… –
На кладах іх гэтак шмат ляжыць.

У застрэшку нудзіцца каса,
Пашчарбаная ад часу і іржы…
А як выпадзе увечары раса –
Горкая маркота на душы.

Заўтра зноў прысніцца на зары
След дзяцінства босы
на расе …
А дарогі ўсе вядуць не ў Рым –
У бацькоўскі кут вядуць усе.

Падымуся, выйду за парог…
І прыпомню ў гарадской смузе:
Каля вёсачкі маёй мурог
Колькі год сумуе па касе…

**Настальгія па вёсцы…**

У горадзе шумным агорне самота
Па вёсцы, дзе бэры, як зоркі, над плотам.

Дзе маці чакае адзінага сына,
Прапалена печ і узбіта пярына.

Астыла з блінамі даўно ўжо мачанка,
А маці чакае ад ранку да ранку.

Хусцінка ў гарошак… Аконная рама…
Да горада лёс нас прыкуў кайданамі.

У гнёздах катэджаў і шматпавярховак
Апрануты душы ў бетоны шпаковань.

З асфальту – дарогі, вітрыны – з неону,
Машын табуны пралятаюць шалёна…

А хлеб іржаны ў супермаркеце стольным
Дурманліва пахне вясковым прыволлем,

Жытнёвай мяжой і бялюткім рамонкам,
Мурожнай травой і пявучай даёнкай,

Расой і туманам, дажджом навальнічным,
Заранкі сяйвом і вадою крынічнай.

…Дзяцей сваіх з горада вёска чакае,
І, нібы матуля, трывожна ўздыхае…

**Суседу**

Не будзь зайздроснікам, сусед,
Для госця ў хаце – насцеж дзверы:
Заходзь, браточак, на абед,
А лепш – з’яўляйся на вячэру.

Адрэжу сала лепшы кус,
Пастаўлю пляшку саматканкі,
Акраец хлеба – на абрус
Ды пагаворым да світанку.

Прыпомнім матчын калаўрот…
Гісторыя ідзе па пятах…
Як раскулачвалі народ
І след хавалі ў Курапатах.

Было… Этапы і ГУЛАГ…
Дарэмна знішчаных – мільёны…
У снах – уздыблены рэйхстаг,
Яму да сёння шлюць праклёны.

Не будзь зайздроснікам, сусед,
Што у мяне ўзышло насенне…
Народ не любіць, хто нясе
Цішком за пазухай каменне.

Народ адчуе ўсё як след,
Дзе – цемната, дзе – проста цені…
Давай жа станем, мой сусед,
Перад народам на калені!

**Сябрам**

Пластуюцца гады, нібы стагі,
А ў тых стагах – мурожная атава,
І наша маладосць, і наша слава
Кладуцца у стажок тугі.

У тым стажку – маленства туманы,
Світальныя і росныя пракосы,
І салаўя вясёлы адгалосак,
І водар маладосці і вясны.

Няхай пабеліць скроні сівізна
І часам лёс ашчэрыцца сурова.
Я спадзяюся, што пракосаў новых
Жыццё яшчэ падорыць нам спаўна.

Няхай каса не тупіцца тады
І будзе сенакоснаю пагода.
Няхай удача кружыць карагодам
І Бог аберагае ад бяды.

Жадаю ўсім шчаслівае пары
У сэрцы, на дарозе, у кватэры…
Да ста гадоў хай стукаюцца ў дзверы
Здароўе, шчасце,
верныя сябры.

**Сказ пра ката**

Касматага і рыжага,
Як восеньскі стажок,
Гарэзу-блінакрада
Нёс бацька у мяшок,
І машыніст пракураны
За пачку папярос
Праныру безбілетнага
На выселкі завёз.

Міналі дні і месяцы,
Як кадры у кіно…
Пра рыжага свавольніка
Забыліся даўно.
Туманам слаўся верасень –
Шчадрэйшы грыбасей…
З дажынкамі-дакопкамі
Сплылі трывогі ўсе.

Дажджом і ветрам ранак
У шыбы грукатаў…
Пачулася за брамкай
Кароценькае «мяў»…
Мы выбеглі з сястрою,
Зірнулі цераз плот –
Аж ток пайшоў па скуры:
Без лапак плакаў кот…

Пушысты рыжык-пыжык,
Праныра-блінакрад…
А да бацькоўскай хаты
Без лап прыпоўз назад.

Малым я быў, а помню,
Як слёзы ліў з сястрой,
Як бінтавалі лапкі
Кашуляю старой…

Буслоў кружыла восень,
Рабіны пёк касцёр…
А дома, каля ганка,
Маўкліва кот памёр.
… Ў заморскіх рэстаранах
Шыкуе блазната…
А я любіць Айчыну
Вучуся у ката.

***

Бы гарачы бурштын,
Твае слёзы, матуля…
Адшалёніў той час,
Калі плакалі кулі…
Толькі лісце і сёння
Зрывае вятрысень
З тых бяроз, ля якіх ты
Шаптала: «Вярніся…»
Толькі травы і сёння
Схіляюцца нізка
Ля бяроз,
дзе сыночкам
тваім –
абеліскі…

**Мая радня**

I
Мая радня не стукае мне ў дзверы,
Не піша пісем, тэлеграм не шле.
Шкадуе мо паштовак ці паперы,
А можа, спраў багата на сяле?

Мая радня, калі успыхнуць зоры,
Калі прыціхнуць сонныя двары,
Са мной у снах да раніцы гаворыць,
З раднёй не грэх і ў сне пагаварыць.

II
…На покуце, дзе абразы святыя,
Дзе ручнікі прыгожыя здавён.
Сам дзядзька Грыша ў рукі трапяткія
Бярэ бывалы свой акардэон.

І песня нараджаецца патроху,
Наладжваюцца ў хоры галасы.
Разлівіста зацягвае Алёхін,
І Толя з Антанінаю з Лясных.

І Славусь, захмялеўшы, са слязою,
І Мечык з Вандай голасам «другім»
Спяваюць разам: «Ярам, даліною…»,
Вячэрні спеў мінае берагі.

А я, малы, дзіўлюся і спрабую
З сястрою Зінай песню падхапіць.
Аж дзед Мікіта круціць галавою:
Не можа самакрутку падпаліць.

…Гудзе застолле, і ліе застолле
Сівуху у кілішкі да краёў.
І дзядзька Жэнік, і з Маросек Коля,
І Мішка з Жэнькай, і Іван з Ваўкоў.

І франтавік-гаёвы – дзядзька Ванька,
Што ад Карусі толькі падышоў,
За стол садзіцца і ўзлятаюць шклянкі
Пад вечнае святое: «Будзь здароў!»

А ў небе месяц туліцца да хмары,
Ліе сваё адвечнае святло.
І нехта з ноччу гэтаю напару
Заблудзіцца надоўга за сялом…

III
Усё я помню. Грэблю і балота,
У Механе тугую сенажаць.
І з кураслепам жоўценькую лотаць,
Ў Казелаве і гадзін, і вужак.

Усё мне блізка, да драбніц знаёма:
І Соньчын вір, і Чорны руч, і лес,
І сажалка з крынічкай каля дома,
І ментузы ў начоўках на стале.

Святое месца. Край дубоў і вербаў,
За Амшарою табуны дзікоў.
Вунь Коля Янукоў ідзе са стрэльбай,
І Петрусіха з кошыкам грыбоў…

…Мая радня, да болю дарагая,
І тыя, хто на могілках даўно…
Я вас усіх пяшчотна абдымаю,
І сніцца сон, як дзіўнае кіно.

**Сястры Зіне**

Нас з табой чаравала
лясная прырода,
Мыраслі з калыханкай
асін і дубоў…
Уставалі зарана,
яшчэ да усходу,
Пастушкамі раслі мы,
сястрыца, з табой.
Шлях адмераў з табой нам
адны кіламетры
Мы з Насілаўскай школы
ішлі за руку
Праз бухматыя гурбы
з марозам і ветрам,
Рукавічкай ты часам
мне грэла шчаку.
А другой выцірала
малечыя слёзы.
Многа сонца было,
многа хмар праплыло…
Адспявалі шпакі
на красуні-бярозе,
Праляцелі гады,
як шпакі за сяло…
Забалоцце старэла,
а бабкі сівелі,
Падзічэлі сады
і не плодзяць даўно…
Ды плывуць успаміны,
нібыта арэлі,
Над мурожным абрусам

ў бяроз пад крылом…
Я шчаслівы таму,
што жывеш ты на свеце!
Хай слязінка на вейцы
толькі ў шчасці дрыжыць.
Хай жа зорка твая
нарачоная свеціць
І вякуецца шчасце
на роснай мяжы.

**Сустрэча**

Сустрэліся ссівелыя дзяды
На шумным асіповіцкім вакзале
І важна пра нялёгкія гады
Гамонку нетаропка завязалі.

Казалі пра сяўбу і пра вясну,
Пра цяжкую вясковую жытуху,
Пра нечыю абрыдлую свякруху,
Пра хіжую, далёкую вайну…

Прыпомнілі… Цыгаркі прыкурылі,
З маўчання сплюнулі і селі у вагон
Якія ж лёсы іх жыццём кружылі?
Якія буры гнулі іх, двухжыльных?
…Жывая памяць да апошніх дзён.

**Чаканне**

*Анастасіі Фамінічне Купрыянавай*

Ты прыціскаеш да вачэй хусцінку,
І слёзы наплываюць зноў і зноў.
Жаўцеюць у альбоме фотаздымкі
Дзяцей, што пажаніліся з вайной.

Не бразне клямка, і не рыпне брамка,
Як некалі ў далёкія гады.
І толькі вокны з вечара да ранку
Гараць агнём чакання маладым.

Вясёлым пеўнем разгарыцца ранне,
Закружаць бусляняты над сялом.
Параненую памяць зноў параніць
Буслiны клёкат – грукат у акно.

...Зноў крыгалом.
Плывуць за крыгай крыга,
Плыве з лазы задумлівы дымок.
Ляцяць буслы,
вясну нясуць на крылах,
А мо сыны
вяртаюцца дамоў?

Да неба ўзняты рукі абеліскаў
Праз бляск гарачы Вечнага агню.
Сціхае нават малады вятрыска,
Каб не спужаць святую цішыню...

**Дабро і зло**

Хай пяюць фанфары нам
У Маскве і Гродна.
У труне адна цана –
Ордэн пасмяротна…

Так вякі яно было,
Так вякамі будзе.
На нажах дабро і зло,
Вінаваты ж людзі.

Нехта хоча піць, гуляць,
Есці асятрыну.
І на ўсё яму пляваць,
Нават на краіну.

Нехта хоча мерседэс,
Яхту на Канарах.
Нехта мае інтарэс
На мільён даляраў.

На законы ставяць крыж,
Нахапаў – і ў ціну…
Ну, а потым у Парыж
З маладой жанчынай.

А Радзіма? Ёй цана –
Дробная манета.
Смак заморскага віна,
Паланіў паўсвету.

Беларусь, тваё дзіця

Сціснута хваробай.
Цэзій, стронцый цела сцяў,
І ў душы – Чарнобыль…

Нібы прыпыніўся час
І бінтуе раны.
У матуліных вачах –
Водбліскі Афгана.

Страшнай ранаю Чачня
Для Расіі стала.
Распаўзаецца штодня
Гідра крыміналу.

Рэвальверы і нажы,
Кілеры за грошы.
Міліцэйскія крыжы –
У вянках прыгожых.

Так вякі яно было,
Так вякамі будзе:
На нажах дабро і зло,
На нажах – мы, людзі!

**Уваскрэшанне**

Адсякалі царквам галовы,
Услаўлялі Юду і Каіна,
Выразалі, як дрэвы, словы –
Міласэрнасць, пакаянне…
Ускармілі сыночкаў Юдавых,
Распладзілі багата іх:
І тэрор на зямлі арудуе,
З гексагенам, гранатамі.
На паветра –
і дзеці,
і школы,
Электрычкі, аўтамабілі…
Рэжуць сэрца
асколкі болю,
Гора,
як чорныя крылы…
Горка плача
зямля згвалтаваная,
Да царкоўных руін
дарога…
Захлынаюся
смехам Каіна…
На каленях чакаю
Бога…

**Рэквіем Афгану**

Міма лёс прашумеў, нібы вецер над дахам.
Я не падаў дэсантам на горны Кабул,
І у спіну нажом не цалялі з размаху,
За скалу не хаваўся ад снайпера куль.

Не рыпеў на зубах горкі пыл Гіндукуша,
І з баямі не браў я крывавы Саланг!
А каго сустракалі на могілках ружы,
Ці чырвоныя зоркі з вайны за Афган.

Ты не плач ля вянкоў, дарагі чалавеча,
Лёс, як цень на сцяне, як праклён на вайне,
Дзе ідэямі душы і розум калечаць,
Дзе з ідэямі дзеці ляжаць у труне.

На далёкай вайне вельмі блізкія страты,
Вельмі родная кроў на зямельцы чужой…
… А матулі чакаюць сыночкаў дахаты,
І вячэрняй, і ранняй парой…

**Ветэран**

Абутак шыць – заробак выпадковы,
Падноскаў і абцасаў не купіць.
Ператварае ён даноскі у абновы
І хоча яшчэ трошачкі пажыць.

Сапраўдны ветэран – якіх нямнога.
З пратэзам боль прыжыўся да нагі.
І ўсё ж, бядак, не выракся ён Бога
Перабірае «Запарожцу» трыбухі.

Ці старцер вінаваты, ці магнета?
Дыміць і пыхкае старэнькі драбадан…
…А ён на танку вызваляў паўсвету,
І ў перамогу верыў ветэран.

Праносяцца навокал мерседэсы,
Нямецкая пампезнасць, не скажы…
А на душы – крывавы след пратэза,
І месеры ў піке… і прага жыць…

І жыў – каб выжыць,
выжыў – каб змагацца.
Змагаецца і сёння ля хлява…
А цыгарэта ўсё не хоча загарацца:
Скажы, сынок, за што я ваяваў?

**Навагодняе**

У пакоі і цёпла, і ціха,
Крочаць ходзікі на сцяне.
Дзед Мароз свой узор на акне
Праз марозныя вусы надыхаў.

Ледзяшы, нібы стрэлкі са стрэх,
А пад месяцам – дзіўныя свечкі…
І за лесам, і там, за рэчкай,
Будзе сёння, як зорак, сустрэч.

І, здалося, над дзедавым садам,
Ў зорным небе – анёлаў сляды…
І, здалося, што назаўжды
Зніклі подласць, падман і здрада.

Зніклі войны, і плач, і кроў –
Анідзе аніводнае страты.
Светла шчасце заходзіць у хаты,
Светла ў сэрцах калег і сяброў…

Загарайся ж, святочна гары,
Навагодняе, зорнае шчасце!
Разам сэрцы і дзверы насцеж
Расчыняй!
Хай заходзяць сябры!

**Тост пад завіруху**

Віруе завірухі калаўрот,
Снягамі запарушаны альтанкі.
Імчыць на тройцы зноў пад Новы год
Вясёлы Дзед Мароз у дзіўных санках.

Яго вітае смехам дзетвара,
І вочы загараюцца ад шчасця.
Страчаюць Дзеда ў хатах і дварах,
Яму граніцы і кватэры – насцеж!

Вузлы праблем рассечаны наноў!
Гарaць на ёлках свечкі і гірлянды.
І пеніцца шампанскае віно,
Калі грымяць разбуджана куранты.

За вокнамі – зімовы калаўрот,
Ды горача ад песень у застоллі…
Я падымаю тост за Новы год,
Я падымаю тост за свой народ,
Жадаю для яго найлепшай долі.

**Прызнанне**

Санеты і чароўныя рамансы
Складаюць геніі ў бяссонні па начах.
Для вас усё: і полечкі, і вальсы
З пяшчотай і каханнем у вачах.

І тосты падымаюць у застоллі,
І п’юць віно за вашу прыгажосць.
Для вас абломваюць чаромхавае голле,
Каб выказаць даверлівае штосьці.

Для вас і жаўранкі свідруюць паднябессе,
Каб сонца палыхала весялей.
І сон-трава, і першыя пралескі
Збіраюцца ў букеты на стале.

Для вас, мае Мадонны і Багіні,
Хто ласкай нас і цешыў, і лячыў.
Прызнання вам, пяшчоты лебядзінай
У сэрцах неспагадлівых мужчын.

Жадаю вам забыць пра боль і слёзы,
Кахаць і верыць, жыць і не тужыць.
Каб з кветкамі страчалі на парозе
Вас дзеткі і каханыя мужы.

**Ноч маладзіка**

Над Случчынаю – ноч маладзіка…
Трапечуць зоркі у рачных затонах,
І цуглямі звіняць на лузе коні,
Лілеямі успенена рака…
Над Случчынаю – ноч маладзіка.

Туман змывае клёны і платы,
Мяжа злучае постаці каханых,
А над зямлёй, у воблачка ўвабраны,
Усходзіць важна месяц малады.

Ад вуснаў загараецца шчака,
Арканы рук мне паланілі шыю.
Каханая, багі мае зямныя
Не ведаюць, як я цябе чакаў
У дзіўны час, у ноч маладзіка…

Начны салоўка сцішыўся на міг,
Мы удваіх пад зоркамі Сусвету.
Тваіх грудзей даспелыя ранеты
Далоняў дакранаюцца маіх.

Ад слоў тваіх хмялее галава:
«Каханы мой, ты для мяне – навекі…»
У асалодзе жмурацца павекі,
І нас прымае вобмацкам трава.

…Няхай з табою канем у вяках,
На могілках вянкі павыгараюць.
Дзве постаці сустрэнуцца за гаем,
Ў тумане белым, да рукі – рука,

У дзіўны час, у ноч маладзіка…

**Снег**

Віруе снег. Так светла на зямлі,
Пад ліхтаром вясковага неону.
І вусны мае шэпчуць улюбёна,
І вочы твае смехам паплылі…

О, час зімы, вялікіх мрояў час,
Неверагодных, казачных сюжэтаў.
Віруе снег пад зоркамі Сусвету,
Нібыта споведзь чыстая для нас.

***

Я плыву да цябе, адзіная,
Як па нотах плыве мелодыя.
Я плыву па азёрнай сіні
Той запозненай лодкаю.
Ты чакай мяне, чуеш, адзіная?
Непадкупная ў свеце трывожным…
Я вярнуся у вёсны буслінья
І цябе абдыму асцярожна.
Прытулю да грудзей пяшчоту,
Засланю ад вятроў уранні.
Я плыву да цябе па нотах
Праз віры і затокі кахання…

***

Светлы дзень ад бялюткага снегу,
Што віруе з-пад самых нябёс.
Эх, шпурнуць бы ў дзяцінства з разбегу
Снежку памяці, шчасця і слёз.

Снег мой, снег! Карагод матыльковы,
Ручніковая бель на зямлі.
Вось бы нам чалавечыя словы
Чысцінёю такой наталіць…

**Адно слова**

Адно толькі слова –
аснова жыцця.
Адны толькі гукі –
як рукі ў адчаі.
Адно толькі слова –
працяг адкрыцця.
Адно усяго –
кахаю!

**Вясна**

І зноў – працяг!
І зноў – пачатак!
Святой мелодыі жыцця.
Кудахчуць куры зухавата,
І разам пеўні каля хаты
Сарвалі голас… І хацця
Тут немагчымае магчыма,
Тут нечаканае, як гром.
Прыйшла вясна, нібы дзяўчына,
А вунь дзяўчына, як рабіна,
У снежным вэлюме… Крылом
Махае бусел ёй, шчаслівай,
І розных фарбаў свет праліў.
Вясна прыйшла дрыготкім дзівам,
Каб дакрануцца палахліва,
Дыханнем цёплым да Зямлі.

***

Зрываюцца гадзіны
з цыферблата…
А свет –
вякамі сіні і зялёны…
Але накрые стрэлка
тую дату,
Дзе зазвініць
будзільнік майго скону.

***

Які прамежак часу
Ад таго песенна-чыстага ранку,
Калі я прашаптаў табе:
«Кахаю…»,
І які кінуў маё слова,
Як каштоўную вазу,
На падлогу.
Асколкі і зараз
Колюць маё сэрца
Незразумеласцю…

***

Я прасіў: заблудзіся ў душы
Непралётным анёлам начным,
Пра каханне нашэптам скажы
Ці развейся, як горкі дым…
. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .
Горкі дым засланіў паўсвету,
З дыму выйшла Яна…
З суседам.

***

Хочаш, праспяваю я пра лета?
Зараз вунь за вокнамі зіма…
А яна:
Ты з фільтрам цыгарэту
Дай мне мілы, бо сваіх няма…

**Матулі**

Рабінавыя гронкі-вугалькі,
Як нешта невыказнае, святое…
Мо гэта слёзы з матчынай шчакі,
Апаленай далёкаю вайною?

***

Мне ты, матуля,
і хлеб, і соль,
Ты – маіх вёснаў
свята.
Прабач мне за слёзы,
за сум і боль.
Можа, ў чым быў
і я вінаваты?

**Маці**

Сон балот –
У клёкаце бусліным,
Шум дуброў –
У песнях салаўя.
Сінь нябёс –
У плачы жураўліным,
Ў голасе тваім –
Уся зямля!

***

Жоравы плакалі зноў,
Верасень…
Босых няма слядоў
На беразе.
Толькі рака цішэй
Плешчацца,
З зорных сівых начэй
Цешыцца.
Круціцца лісцяў рой,
Раніца…
Зноў ты у снах са мной,
Абранніца.
Толькі плывуць гады,
Верасень…
Нашы былі сляды
На беразе…

**Жураўліная зара**

Адзвінела павуціна
Над абрусам мурагоў…
Восень выткала хусціну
Дзіўным золатам стагоў.

І рукою чараўніцы
Сыпанула ў бор агню,
Дзе бярозкі-маладзіцы
Рады сонечнаму дню…

Дзе зязюлі кукавалі,
Дзе чаромхі цвет кіпеў,
Дзе асінкі уздыхалі
Пад дзявочы срэбны спеў…

Эх, часіна залатая,
Вераснёвая пара!
Смуткам сэрца не кранае…
Жураўліная зара.

***

Вярба прыбегла за сяло
Страчаць світанак з намі,
І месяц, ломячы крыло,
Зваліўся за барамі.
Зязюлька, будзячы зару,
Закукавала ў гаі.
Я не маўчу, я гавару:
Кахаю, дарагая!..

***

Самае глыбокае –
веснавое неба.
Самыя шчаслівыя –
у дзяцінстве.
Самыя багатыя –
у застоллі хлебам.
Самыя магутныя –
у адзінстве.

***

Звініць ваколле гуслямі,
Туман улёгся спаць.
Цалуе месяц вуснамі,
Тугую сенажаць.

А коміны узчубілі,
Блінамі пахне дым.
Сцяжынкі смех прыгубілі
У гаі маладым.

З паркана певень будзіць,
Світанак на палях,
А хлопцы ў паплавах
На блёсну сонца вудзяць.

***

Нахлынула,
як ліўні ўсіх стагоддзяў…
Як вадаспады свету на мяне
Упалі ўраз…
Я месца не знаходзіў…
А днём знаходзіў,
дык губляў у сне.
І сон – як снег…
А снег у шэрых лужах
Знікаў і падаў,
падаў і знікаў…
Яна прыйшла не цеплынёй,
а сцюжай,
Сустрэў яе,
сустрэў – і пакахаў.
Не пакахаў,
а захварэў раптоўна,
Не захварэў,
а палыну глынуў…
Яна ўзышла у сэрцы
яснай поўняй,
А ці не горка там
ад палыну?

***

Набіраю гады, як балы…
Іх сціртуецца больш і больш.
Мой жыццёвы суддзя – няўдалы:
Не залічыць пакуты і боль.
Не залічыць кахання вёсны,
Пацалункавы зарапад,
З патаемнай усмешкай вусны
І зямное:
– Я рада…
– Я рад…
Не залічыць гаёвае рэха,
Што ад пошчаку вусны пячэ…
Не залічыць крылаты ветах
У блакіце тваіх вачэй.
Не залічыць ужо ніколі…
Рэха памяці будзіць гай…
Перадражняць вагонаў колы
Слова сумнае тое: «Бы-вай…»
Набіраю гады, як балы…
Іх сціртуецца больш і больш…
Прысудзіла жыццё мне вакзалы,
І растанне,
                    і мукі,
                              і боль…

**Было вяселле…**

Вяселле, танцы, месячная ноч,
Гітары апантаныя стагналі.
Хоць клуб вялікі, ды усе наўзбоч
Калі не шэйк, дык польку зачыналі.

Абцасы узрываліся, як тол,
Віхурыў вецер падалы дзяўчатам.
А побач бабка, глянула наўкол,
Схапіла раптам хлопца зухавата…

І з ім – у круг, і пад гітарны жар
Круціцца да знямогі – маладою…
Упаў румянец на старэнькі твар,
Бы ружы зацвілі перад зімою.

Я ружы бачыў і нябачны час:
Дзяўчына ў танцы – дваццацігадовай.
… Няўжо і ты калісьці выпадкова,
Мая каханая – бабуляю у пляс…

**Арэлі  адзінства**

Амытыя дажджом
дзіцячыя арэлі
Гушкалі,
нават песцілі таго,
каго сустрэлі
Праз дваццаць год:
Не белабрысым хлапчанём,
А юнаком,
з гарачым сэрцам…
Амытыя дажджом
дзіцячыя арэлі
Старэлі
І не пазналі ўжо таго,
Каго сустрэлі
праз дваццаць год…
І раптам пець-рыпець
арэлі перасталі,
Напэўна, юнака таго яны пазналі…
Ляжыць мая рука
на іх халоднай сталі…
Там гушкануўся ўміг,
нібы грыбочак,
Мой белабрысенькі
малы сыночак.

## Жонцы

Я жадаю зусім нямнога:
Ад трывог хай збароніць Бог.
Каб і сыну, і мужу ў дарозе
Позірк любы твой дапамог.

Каб свяцілася зорка начная
Над прыгожай тваёй галавой.
Я нямнога табе жадаю:
Будзь каханай і дарагой.

## Віншаванне

Хай Новы год з вірлівай завірухай
Прыносіць плён і шчасце Беларусі.
Каб мой народ не зведаў слёз і скрухі,
Я за Радзіму светлую малюся.

Сябры мае, найлепшыя у свеце,
Хай узляцяць да зорак спадзяванні.
Каб з вышыні убачыць на планеце,
Як шчасце абдымаецца з каханнем.

## Жалоба

Часам пара перажыць настае
Гадзіны расстання з адзінай каханай.
Хавае альбом фотаздымак яе,
А сэрца – боль несхаваны…

Пачуцці ў мінулым, як громны надлом,
Як летняга ліўня шалёнае марыва.
Чужое вяселле гудзе за сталом,
Няўжо пра такое ты марыла?

У сэрца другога хаваюць хутчэй
Блакіт яе вочак спужаных…
І зараз той вэлюм агнём пячэ,
Каханай маёй, нясуджанай.

## Другі бок манеты…

Яна яго прасіла: «Не кідай,
Малыя ж застануцца дзеткі…»
А ён рукой піхнуў яе:
«Бывай!»
Рукою ж той дарыў калісьці кветкі.

**Залатое вяселле**

Пяцьдзесят салаўіных аркестраў
Над зямлёй урачыста звінелі.
І гучала мелодыя рэтра,
І кілішкі іскрыста гарэлі.

Пяцьдзесят салаўіных аркестраў
У вішнёвых садах адгрымела.
Пад вясновыя ліўні і вятры,
Перуновыя стрэлы.

За акном завіруха віруе,
І віно маладое хмеліць.
Малады з маладою танцуе
Ў залатое вяселле.

І няхай сівізна ў «маладога»,
Пасівела даўно «нявеста».
Ім іграць яшчэ будуць доўга
Пяцьдзесят салаўіных аркестраў.

**Алесіна**

Снягамі сінімі занесена
І спавівальнымі туманамі.
Жыве азёрнае Алесіна
Малітвамі і спадзяваннямі.

Тут, нібы храм, стаіць святліца,
Дзе не сумуецца ніколі.
Гамоніцца і смачна спіцца
У Раманенкі Любы з Колем.

Тут я не бачыў нават хмары,
Бяда не ходзіць каля весніц.
Бо тут сябры, як сам ты, марац,
І лечыць лазня, і грэе песня.

**Калыханка**

Непамерна далёка,
У вячэрніх заранках,
Засыналася лёгка
Пад тваю калыханку.

Вечарова заснулі
Над зямлёю заранкі.
Спіць мой ціхі сынуля
Пад тваю калыханку.

**Калі радкі гавораць…**

*Міколу Шабовічу*

Паэт не любіць гаварыць,
Бо за яго радкі гавораць.
Увечары і на зары,
У радасці,
            бядзе
                        і горы.

На свет глядзіць ён не здалёк,
Ён гоіць словам сэрца раны,
Яго змагаецца радок
З бяздушшам,
            сквапнасцю,
                        падманам.

Ён славіць песняю свой край,
Ён не стамляецца ніколі.
І сум яго – з яго пяра,
З ягонай радасці і болю.

**Паэт**

*Памяці Віктара Бародзіча*

Апошні шлях у чорнай дамавіне
Да вечнага прытулку, пад крыжы…
Зямля агорне небараку-сына,
Які багам паэзіі служыў.

Які ў душы агонь не растранжырыў,
На пераправе коней не мяняў…
Які жыццё пражыў – не пасажырам,
А воз жыцця цягнуў заміж каня.

Быў чалавек па прозвішчы Бародзіч…
Ды збегліся стракатыя вянкі
На могілкі, дзе душы адыходзяць,
Каб зоркамі успыхнуць праз вякі.
Апошні шлях у чорнай дамавіне
Да вечнага прытулку, пад крыжы…
Бывай, паэт! Агонь твой не загіне
І песня, што гняздзілася ў душы.

**З родных вытокаў**

*Рыгору Сароку*

Італію славіць Расіні
Душою багатай, шырокай.
Славіць Чайкоўскі Расію,
А Беларусь – Сарока!

Сібеліус славіць фінаў
Фальклора глыбокім вытокам.
Для Чэхіі Дворжак за сына,
Для Беларусі – Сарока!

Песня не згіне, што тчэцца
З родных айчынных вытокаў.
Зноўку хвалюецца сэрца,
Як чуеш Рыгора Сароку.

Хай струны пяюць аркестра,
Ўзлятаючы пад аблокі.
І славіць свой край маэстра,
Сын Беларусі – Сарока!

**Славуты музыка**

*Маэстра Леаніду Шурману*

Ён ноты знаходзіць у хмарах грымотных,
Ён музыку чуе у ветры самотным.
У хвалях жытнёвых, бярозавым шуме,
Славуты музыка па прозвішчы Шурман.

У песнях яго – нарачанскія сосны,
Над нёманскай кручай – дзявочая постаць,
І водар кахання, і пах чабаровы,
І звонкі жаўрук над Радзімай вясновай.

Кранае ён сэрцы вясёлым баянам,
І голасам чыстым, ў душу увабраным.
Ён песні складае без фальшу і тлуму,
Таму яго песні не ведаюць суму.

Я славы прарочыць табе не бяруся,
А добра, што славу пяеш Беларусі.
Дык дай табе Божа, пясняр наш, маэстра,
Вялікага шчасця, сусветных аркестраў.

**Такім ён быў…**

*Уладзіміру Семашкевічу*

Такога больш музыкі не знайсці
На нашай Беларусі сінявокай.
Яго баян да сэрцаў шлях масціў,
Крынічным трапяткім вытокам.

Душа была з агню, і ў тым агні
Было нязручна
          самай злоснай
                    сцюжы.
І нават злыя душы ён радніў,
І на марозе ён запальваў ружы…

Любімай школе сэрца аддаваў,
Любіў дзяцей, любіў сяброў харошых.
Ды вось баян яго засумаваў,
У вечны шлях гаспадара правёўшы.

Свае масточкі ён недамасціў,
Яго праводзіць неба, людзі, дрэвы.
Такога больш музыкі не знайсці,
Які́м ён быў – Валодзя СЕМАШКЕВІЧ!

**Вяртанне праз вечнасць**

(казачны сон)

Праз сто сузор'яў і ніяк не меней,
Праз шум вятроў і здзірванелы мох
Вярнуўся на зямлю, як летуценнік,
На скрыжаванне лёсаў і эпох.
Вярнуўся праз дрымотныя стагоддзі
У вечны хор даёнак і званоў…
Вярнуўся я на белым параходзе
Да прыстані паданняў і замоў.
Сустрэлі бабкі пенным сырадоем,
Суседзі запрасілі на начлег…
І зазвінела печ скаварадою,
Касцёр бліноў успыхнуў на стале.
І на парог ступіла так нясмела
Блакітнавокая вясковая вясна…
І, як калісьці, дзіўна паглядзела,
Была гэта каханая,
яна…

**Школа стала лёсам**

*Касцюку Р. П.*

Нялёгкі час на долю хлопца выпаў,
Зрадніўся рана з плугам і касой.
Пажар вайны ягоны шлях пасыпаў
І попелам, і мудрасцю зямной.

Ён да навукі кіламетры мераў,
Ляцелі мары да высокіх зор.
І ў школе кожны некалі паверыў,
Што стане матэматыкам Рыгор.

І стала школа лёсам і натхненнем,
За класам клас выходзіў выпускны.
І вось ужо якое пакаленне
Яму жадае шчасця і вясны.

**Людзі такога складу**

*Аляксандру Клешчуку*

Ёсць людзі такога складу –
Усё ў іх ідзе на лад!
І дома такому рады,
І кожны, хто стрэне, рад.

Працуюць такія плённа,
Не пакладаючы рук.
У працу яны ўлюбёны,
Такі – Аляксандр Кляшчук.

Працуе – не знае стомы,
І ведаюць землякі:
Ён муж адмысловы дома
І бацька яшчэ які.

У дзетак – адны пяцёркі,
У жонкі – вясёлы твар,
А сам, нібы знатны Цёркін,
І смех паважае, і жарт.

Ён цэніць любоў і дружбу,
Сябрам дапаможа ў бядзе,
Нідзе: ні ў гасцях, ні на службе –
Ніколі не падвядзе!

**Імгненне выбару**

*Памяці лейтэнанта міліцыі*
*У. Сцяпанава*

На бітым, асколачным шкле
Не кожны станцуе босы…
А ён бы, напэўна, змог.
Такое, чамусьці, здалося…

Людзей паважаю адчайных,
Адчыненых насцеж, наскрозь.
Не ў рэстаранах ці чайных,
Расчуленых спіртам да слёз.

Людзей паважаю строгіх,
І мужных, і дзелавых.
Не страшна якім нічога,
Нават як б'юць пад дых!

Такія не лічаць раны,
Не лічацца з часам і сном.
Даруй мне, таварыш Сцяпанаў,
Ты стаў мне высокім святлом.

Ты стаў мне высокай зоркай,
Першай велічыні.
Бывае на сэрцы горка
Ад гэтай святой чысціні.

Хвіліны, секунды, імгненне…
Доўгае, да нематы.
З ганьбаю жыць на каленях? –

Гэта не новы матыў!

Чулі нутром падонкі:
Будзе той праведны суд.
Маскіравалі тонка
Рук неадмыўны бруд.

Подла і ціха, з рызыкай
Нелюдзь курок адцяг…
Стрэл – па законах фізікі,
Смерць – па законах жыцця.

На бітым, асколачным шкле
Не кожны станцуе босым…
А ён бы, напэўна, змог,
Такое, чамусьці, здалося…

**Год Іванова**

*Народнаму артысту*
*Беларусі В. К. Іванову*

Нота да ноты, як спова да слова,
Музыка, ў песнях агнём трапячы!
Зноўку мелодыя Іванова
Гэтак пяшчотна у сэрцы гучыць.

Будуць акорды святою замовай
Сэрца з душой за жывое кранаць.
Зноўку мелодыя Іванова
Лучыць з зямлёю роднаю нас.

**Валацуга з вясковай дарогі**

*(жартоўнае)*

Як выпраўляўся я ў шлях далёкі,
Зычылі ўсе мне добрай дарогі.
Маці сушыла слёзы хусцінкай:
Добрай дарогі, любы мой сынку.
Любая, родная і трапяткая:
Добрай дарогі, я пачакаю…
Як выпраўляўся я, воз запрагалі,
Сала і бульбы ў дарогу паклалі.
Венчык каўбаскі, яшчэ паляндвіцу,
Трохі пякучае боскай вадзіцы.
Яек і мёду паклалі ў ванзэлак,
Вязку цыбулі, вяндліны шматэлак…
Маці ў дарогу перажагнала:
-Яйкі – дацэнту, прафесару – сала.
Мёд і вяндліна самому дэкану…
Будзь, мой сыночак, ва ўсім паслухмяны.
…Любая доўга хусцінкай махала.
Вёска са мной ў БДУ паступала.

**Сцяжынка ў жыццё**

*Шупляк Веры Іванаўне*

Высокі ганак, ліпы ў два рады,
Сцяжынка у жыццё накіравана.
Па ёй я крочыць буду праз гады,
А што там у жыцці наканавана?
…Прыціхла школа, выпусціўшы нас,
І мы, нібыта з гнёздаў птушаняты,
Ляцім па свеце, і ў каторы раз
Для нашай класнай – выпускное свята.
Мы застанёмся дзецьмі для яе,
І з сівізною дочкамі, сынамі.
А наш 10 Б, ці не стае
Яго цяпер за школьнымі дзвярамі?
Высокі ганак, ліпы ў два рады,
Сцяжынка стала у жыцці дарогай…
Іду па ёй праз буры, праз гады,
Каб класнай «Дзякуй!»
вымавіць з парога…

**Слуцкая лазня**

У слуцкай лазні пахне спелым дубам
І маладым бярозавым лістом.
Калі ад пары венікі усчубяць,
З палка, браток, не упадзі пластом.

Тут пахне півам, што свярбіць у роце.
Трашчаць сухія плоткі, шчупакі.
І рояцца ля столікаў у поце,
Расчырванелыя ад пары слуцакі.

Гамонка тут, нібы на Камароўцы,
Пра Польшчу, пра палітыку ў вярхах.
Народнае падсоленае слоўца
Смакуецца на вострых языках.

Пачуеш тут пра бойкі і здарэнні…
Інтым для слуцкай лазні – навіна!
«Яго ў машыне бачыў … без адзення,
Ды разам з ім была… яна…»

У рогаце – пра Пецьку анекдоты,
У слёзах – успамін франтавікоў.
Тут лечацца хваробы і згрызоты,
Тут пераблытана з нядзеляю субота,
І піва ў куфлях пеніцца наноў.

…У слуцкай лазні пахне спелым дубам,
Духмяністым бярозавым лістом.
Калі ад пары венікі усчубяць,
З палка, браток, не упадзі пластом…

**Наваражыла…**

Мяне цыганка цягне ўбок,
Агнём вачэй пякучых
І так ласкава: «Галубок,
Наваражу…
                    дай ручку…»

Убок адводзіць незнарок,
Шчабеча нешта жвава,
Пытае ўсё пра кашалёк:
Заплаціш як, цікава?..

Ты адкажы мне, што баліць?
Якія сушаць мукі?
А кашалёк я, так і быць,
Шпурляю прама ў рукі.

Што пачалося, божа мой,
Цыганка аж спацела.
Круцілася ля рук лісой,
Пра сэрца нешта пела…

Я слухаў ціха, не злаваў,
Ды ўсё-ткі не стрымаўся:
Баліць, дурніца, галава,
Яшчэ не пахмяляўся…

## Па грыбы…

Мяне будзіць на золку матуля,
Праганяе загадкавасць сноў:
– Уставай у грыбы, мой сынуля,
Ужо ў поле пагналі кароў.

Злажу, сонны, з мурожнай пярыны,
За дзвярыма туманны сает,
Пахне ў дзедавым садзе малінай,
Дзе нязменна салоўка пяе.

Абуваю гумовыя боты,
Свежасплецены кош – у руку.
І бягом ад надзённых турботаў
Па грыбным верасовым ляску…

## Світанак

Плыве ў туман задымленае лета,
Спявае салаўіны вадаспад,
І дзіўны месяц воблакам-берэтам
Уночы спела падае на сад.

Ужо раса кранае ціха травы
І разлучае нечыя сляды…
І ўжо світанак на усю актаву
Бярэ акорд бяссонню маладых.

**Цяжкі рок**

Раве здзічэла цяжкі рок,
Гітары рвуць душу і душаць…
Быка так проста не раз’юшыш,
Хоць і абломіш палкай рог…

Раве шалёна рок-метал!
І моладзь горада з раёнам
У гэты вэрхал улюбёна,
Дрыжыць і дыхае ўтрапёна,
Нібы ў гарах камнеабвал.

Раве і стогне рок-рака
Надрывам п’янага экстазу…
Дрыжаць падлеткі усе разам
У грознай музыкі ў руках.

І душыць
                    металічны рок!
Душа мелодыі канае…
А салаўі ў гаях спяваюць,
Да іх ад сэрца – толькі крок…

***

І ўсё-ткі я мілую гэты свет,
Дзе межы ёсць у злосці і пяшчоты,
Дзе ўсё часцей сябе пытаю: «Хто ты?
І дзе твайго быцця сакрэт?»
Калі не госць, чаму тады ўначы
Так вабяць зоркі ціхай таямніцай?
Чаму, калі планета загарыцца,
І сэрца пачынае гулка біцца,
І памяць аніколі не маўчыць?

**Зямныя яблыкі**

З травы падымаго яблык –
Спелы крамяны ранет,
Які быў пупышкай,
Стаў кветкай,
Зваліўся яблыкам…
І так мільёны гадоў…
Падаюць, падаюць яблыкі
На грэшную нашу зямлю…
Каб не забылі зямляне,
Як смачна пахне ранетамі
На грэшнай нашай зямлі.

***

Не магу уявіць без сцяжынак дарог,
Без дажджу – ручаёў і лужын.
Не ўяўляю кахання без слёз і трывог,
Без шыпоў – сарамлівай ружы.

Не магу уявіць акіяна без рэк,
Без валошак – жытнёвага поля.
Веру я: аніводны ў жыцці чалавек
Без сяброў не ўяўляе застолля.

***

Кожнага з нас сустракае Зорка,
Калі мы з’яўляемся на свет Божы.
Кожнага з нас праводзіць Свечка,
Калі мы збіраемся ў Вечнасць.
Вось так і жывём мы на гэтай Зямлі:
Паміж Зоркай і Свечкай.

**ЗМЕСТ**

Зямля адна
***Трэба дзецям сон…
Мой край
Браточкам – беларусам
***Цудоўны край мой…
Землякам
***Беражыце ў жыцці не гадзіннік…
Бярозы
Вялікдзень
***Праламацца б у зоркавы рой…
***Як многа трэба чалавеку…
***Каля вёсачкі маёй мурог…
Настальгія па вёсцы
Суседу
Сябрам
Сказ пра ката
***Бы гарачы бурштын…
Мая радня
Сястры Зіне
Сустрэча
Чаканне
Дабро і зло
Уваскрэшанне
Рэквіем Афгану
Ветэран
Навагодняе
Тост пад завіруху
Прызнанне
Прызнанне
Ноч маладзіка

Снег
***Я плыву да цябе, адзіная…
***Светлы дзень ад бялюткага снегу…
Адно слова
Вясна
***Зрываюцца гадзіны…
***Які прамежак часу …
***Я прасіў: заблудзіся ў душы…
***Хочаш, праспяваю я пра лета…
Матулі
***Мне ты, матуля, і хлеб, і соль…
Маці
***Жоравы плакалі зноў…
Жураўліная зара
***Вярба прыбегла за сяло…
***Самае глыбокае…
***Звініць ваколле гуслямі…
***Нахлынула…
***Набіраю гады, як балы…
Было вяселле
Арэлі адзінства
Жонцы
Віншаванне
Жалоба
Другі бок манеты
Залатое вяселле
Алесіна
Калыханка
Калі радкі гавораць
Паэт
З родных вытокаў
Славуты музыка
Такім ён быў
Вяртанне праз вечнасць

Школа стала лёсам
Людзі такога складу
Імгненне выбару
Год Іванова
Валацуга з вясковай дарогі
Сцяжынка ў жыццё
Слуцкая лазня
Наваражыла
Па грыбы
Світанак
Цяжкі рок
***І ўсё-ткі я мілую гэты свет…
Зямныя яблыкі
***Не магу уявіць без сцяжынак дарог…
***Кожнага з нас сустракае Зорка…

*Літаратурна-мастацкае выданне*

**ЦЫБУЛЬСКІ Канстанцін Пятровіч**

# БАЦЬКОЎСКІ ЗРУБ

Вершы

Рэдактар
*Н. І. Мельнічэнка*

Дызайн вокладкі
і камп'ютарная вёрстка
*Л. У. Гатавіцкая*

ГА "Мінскае абласное аддзяленне
Саюза пісьменнікаў Беларусі".
Пл. Свабоды, 13-1, 220013, г. Мінск.
Тэл./факс: 8(017) 347 08 60.
E-mail: maaspb.m@yandex.by
www.maaspb.by